УДК 373.3:811.161.1

# РАЗВІЦЦЁ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОТЫ

***А. У. Зычкова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***А. А. Папейка***,
канд. філал. навук, дацэнт

Пазакласная работа па беларускай мове з’яўляецца неад’емнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу і ўяўляе сабой абавязковы элемент добра арганізаванай працы школы. У метадычнай літаратуры пазакласная работа разглядаецца як дадатковы сродак фарміравання ў вучняў цікавасці да прадмета, пашырэння і паглыблення ведаў, што набылі вучні на ўроках беларускай мовы. І хоць канчатковыя мэты ўрокаў і пазакласных заняткаў супадаюць, пазакласная работа мае свае, важныя для навучання і выхавання мэты і задачы. Яна павінна садзейнічаць не толькі развіццю ў вучняў інтарэсу да роднай мовы, але і выхаванню ў іх беражлівых адносін да слова, да багаццяў мовы, імкнення не толькі авалодаць гэтымі багаццямі, але зберагчы і ўзбагаціць духоўны скарб беларускага народа.

Задачы пазакласнай работы па беларускай мове ў пачатковых класах:

1) садзейнічаць больш трываламу і свядомаму засваенню вывучаемага на ўроках матэрыялу;

2) развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў, паглыбляць і пашыраць іх веды па асобных раздзелах мовы, што засвоены на ўроках;

3) удасканальваць навыкі лінгвістычнага аналізу;

4) павышаць узровень моўнага развіцця дзяцей;

5) садзейнічаць развіццю самастойнасці вучняў;

6) ствараць умовы для выхавання глыбокіх духоўных запатрабаванняў і развіцця творчых здольнасцей школьнікаў [1].

У пазакласнай работы ёсць багатыя магчымасці развіцця слоўнікавага запасу вучняў. Перш за ўсё яно адбываецца праз гучанне беларускага слова, чытанне літаратурных твораў на беларускай мове, развучванне вершаў.

З мэтай развіцця слоўнікавага запасу вучняў настўнік у сваёй працы павінен выкарыстоўваць розныя мерапрыемствы, напрыклад, віктарыну “Знаўцы слова”, якая ўтрымлівае цікавыя пытанні: загадкі, гульні са словамі “Патлумач”, “Перакладчык” і інш. Такія гульні даюць вучням магчымасць патрэніраваць памяць і выявіць эрудыцыю.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, развіццю слоўнікавага запасу першакласнікаў спрыяюць не толькі ўрокі беларускай мовы, але і пазакласныя мерапрыемствы, якія праходзяць у цікавай для дзяцей гульнявой форме.

**Літаратура**

1. Кравцова, Е. Е. Игра и учение в младшем школьном возрасте / Е. Е. Кравцова // Начальная школа. – 2004. – № 4. – С. 23–26.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова